КАНФЕРЭНЦЫЯ
НОВАЯ
БЕЛАРУСЬ 2025

Рэзалюцыя дэмакратычных сілаў Беларусі
да Канферэнцыі «НОВАЯ БЕЛАРУСЬ» 2025

# Аб недапушчальнасці парушэння свабоды сумлення і веравызнання ў Беларусі

Мы, прадстаўнікі і прадстаўніцы дэмакратычных сіл Беларусі,

Рашуча асуджаем сістэматычныя парушэнні права на свабоду сумлення і веравызнання ў Беларусі, якія здзяйсняюцца рэжымам Лукашэнкі. Рэпрэсіі супраць рэлігійных арганізацый з'яўляюцца часткай шырокамаштабнай кампаніі па знішчэнні грамадзянскай супольнасці і падаўленні любых формаў альтэрнатыўнай грамадскай ідэнтычнасці.

Пачынаючы з 2020 года, улады мэтанакіравана знішчаюць незалежныя арганізацыі пад выглядам «барацьбы з экстрэмізмам» і «дэстабілізацыяй». Агулам за гэты час знішчаныя каля 2000 арганізацый грамадзянскай супольнасці. У 2021 годзе былі атакі на праваабаронцаў, у 2022 – на прафсаюзы, у 2023 – на палітычныя партыі. У 2024–2025 гадах рэпрэсіі перакінуліся на рэлігійныя супольнасці.

Прынятыя папраўкі ў Закон «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях» абавязалі ўсе канфесіі прайсці перарэгістрацыю да 5 чэрвеня 2025 года. У той жа час, згодна з Крымінальным кодэксам Беларусі (арт. 193-1) прадугледжана крымінальная адказнасць за любую дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі.

***Вядомыя шматлікія факты пазбаўлення дзяржаўнай рэгістрацыі рэлігійных супольнасцяў розных канфесій на падставе гэтага рэпрэсіўнага заканадаўства. У выніку шэраг парафій і рэлігійных груп апынуліся па-за межамі прававога поля і пад пагрозай крымінальнага пераследу.***

Адначасова мы адзначаем жорсткія рэпрэсіі супраць духоўных асоб, якія не падпарадкоўваюцца прапагандзе рэжыму:

— у снежні 2024 года каталіцкі святар Генрых Акалатовіч быў асуджаны на 11 гадоў пазбаўлення волі за меркаваны шпіянаж на карысць Польшчы і Ватыкана;

— 17 кастрычніка 2022 года праваслаўны святар Сяргей Рэзановіч атрымаў 16 гадоў за нібыта «змову з мэтай захопу ўлады»;

— 30 красавіка 2025 года святар Анджэй Юхневіч быў асуджаны на 13 гадоў пазбаўлення волі — пасля некалькіх арыштаў і абвінавачванняў у экстрэмізме за публікацыю фота з нацыянальнай і ўкраінскай сімволікай.

Паводле звестак праваабаронцаў, з 2020 года рэпрэсіям падвергліся не менш за 74 святары ўсіх канфесій — каталіцкія, праваслаўныя і пратэстанцкія. Сярод формаў пераследу: арышт, штрафы, вобшукі, звальненне, забарона на служэнне і вымушаная эміграцыя.

Мы лічым, што такая палітыка — гэта не толькі парушэнне Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і міжнародных дамоў, але і замах на духоўную і культурную разнастайнасць беларускага грамадства.

Асабліва сімвалічнай з'явай з'яўляецца знішчэнне беларускамоўных набажэнстваў. У Мінску застаўся толькі адзін праваслаўны храм, дзе літургія адбываецца на беларускай мове. Гэта — паказальны акт дыскрымінацыі, накіраваны супраць нацыянальнай самасвядомасці.

***У гэтай сувязі мы патрабуем:***

— адмяніць рэпрэсіўныя папраўкі ў Закон «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях»;

— адмяніць артыкул 193-1 Крымінальнага кодэкса, які крыміналізуе дзейнасць незарэгістраваных арганізацый, уключаючы рэлігійныя групы;

— вызваліць усіх духоўных асобаў, якія былі зняволеныя па палітычных матывах;

— вярнуць вернікам канфіскаваныя храмы, уключаючы Чырвоны касцёл у Мінску;

— спыніць уціск, цэнзуру і адміністрацыйны кантроль над рэлігійнымі супольнасцямі;

— аднавіць рэгістрацыю ўсіх рэлігійных арганізацый і супольнасцяў, якія былі пазбаўленыя яе па палітычных ці адміністрацыйна-надуманных прычынах, у тым ліку падчас перарэгістрацыі ў 2024–2025 гадах.

***Мы звяртаемся да міжнароднай супольнасці з заклікам:***

— неадкладна адрэагаваць на парушэнні свабоды веравызнання ў Беларусі;

— забяспечыць рэгулярны міжнародны маніторынг і дакументаванне парушэнняў;

— заклікаць Спецпрадстаўніка ЕС па пытаннях свабоды веравызнання да расследавання гэтых выпадкаў;

— прадастаўляць юрыдычную і тэхнічную падтрымку пераследаваным рэлігійным супольнасцям;

— спрыяць развіццю міжнароднай салідарнасці паміж канфесіямі і дапамозе тым, хто вымушаны пакінуць Беларусь;

— узмацняць супрацоўніцтва з міжнароднымі праваабарончымі структурамі і беларускім грамадзянскім грамадствам для забеспячэння празрыстага і рэгулярнага маніторынгу сітуацыі.

Мы пацвярджаем, што свабода сумлення — гэта не толькі права чалавека, але і непарушная падстава для міру, згоды і дэмакратыі.

*Прынята на Канферэнцыі «Новая Беларусь»*
*Варшава, жнівень 2025 года*